Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»
Кафедра славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі
Кафедра гісторыі Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# БЕЛАРУСЬ У ЭПОХУ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ УЗРУШЭННЯЎ:

## *Да 100-годдзя выхаду ў свет газеты «Наша ніва»*

*Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі*

г. Мінск, 10 лістапада 2006 г.

Мінск 2006

# ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ў БЕЛАРУСІ НА СТАРОНКАХ «НАШАЙ НІВЫ»

А.Э. Лютая г. Мінск, БДПУ

Сусветны эканамічны крызіс 1900-1903 гг. і дэпрэсія, якая працягвалася да 1908 г., аказалі значны уплыў і на гаспадарку Беларусі. За гэты час, напрыклад, у рамесна-саматужнай вытворчасці колькасць прадпрыемстваў скарацілася на 4,3 тысячы, а валавая прадукцыя – на 4492 тыс. руб. (8,2%). Лік адносна буйных (цэнзавых) прадпрыемстваў за тыя ж гады павялічыўся з 799 да 1008 (на 26,2%), а іх валавая вытворчасць вырасла на 37% і склала амаль 42% прадукцыі ўсёй прамысловасці [1, с. 241; 2, с. 401].

"Наша ніва" ад 22 снежня 1906 г. паведамляла аб стварэнні ў Мінску «торгова-промышленнага саюза» фабрыкантаў і заводчыкаў [4, с. 7].

Высокімі тэмпамі развівалася дрэваапрацоўчая прамысловасць. Эканамічны крызіс прымусіў купцоў – гандляроў лесам будаваць новыя заводы ў Бабруйску,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Нова-Барысаве, Мазыры, Рэчыцы, у многіх памешчыцкіх маёнтках [2, с. 402]. Развіццю буйной прамысловасці ў асобных гарадах шкодзіла адсутнасць свабодных зямельных плошчаў. Так, напрыклад, у Мінску, як пісала "Наша ніва" ад 2 лютага 1907 г., зямля належала манастырам, цэрквам, архірэю, а таксама дваранам Ваньковічу, Немашарскай і інш., а рамеснікі, купцы і заводчыкі выплачваюць вялікі чынш за землі, на якіх пабудаваны іх майстэрні, магазіны, заводы, фабрыкі і дамы [3, с. 7].

Стрымліваў развіццё прамысловасці ў гарадах Беларусі і нацыянальны склад гараджан. Больш паловы гараджан былі яўрэямі, якія павінны былі плаціць большыя падаткі, чым праваслаўныя, і большасць з іх належала да гарадской бедноты. "Наша ніва" пісала ў маі 1907 г., што сярод яўрэяў ёсць фабрыканты і багатыя купцы, але іх вельмі мала [6, с. 3-5].

Як і ў XIX ст., для беларускіх мястэчак і вёсак было характэрна развіццё хатніх промыслаў і рамёстваў. "Наша ніва" ад 11 (24) сакавіка 1908 г. паведамляла, што ў сельскай мясцовасці былі цэнтры хатняга рамяства: мястэчка Койданава ( 8 майстроў робяць кошыкі), каля Свенцян у вёсках Батвіпішках, Барванішках, Пранелях займаліся вырабамі посуду, у мястэчку Смаргонь пяклі выдатныя абаранкі. Фабрыкант Мітрафанаў ў г. Дзвінску пабудаваў вялікую фабрыку і прадаваў у Расію "смаргонскія" абаранкі. У мястэчку Івянец Мінскай губерні выраблялі добрую кафлю, на Палессі жанчыны ткалі рознага роду тканіну. У Свенцянах Ашмянскага павету была створана школа, дзе вучылі дзяўчат шыць. Але тэмпы развіцця рамёсел і якасць вырабаў у Польшчы, цэнтральных губернях Расіі былі значна лепшымі, і збываць вырабы беларускіх рамеснікаў за мяжой было немагчыма [5, с. 4-5].

"Наша ніва" ад 11 (24) сакавіка пісала пра выставку ў г. Слуцку. Быў створаны аддзел хатняга рамяства: вырабы з лёну і воўны, тканіна, палатно, ручнікі, спадніцы, паясы, сукно на буркі з мястэчка Стаўбцы, ганчарныя вырабы з вёскі Даросін, кадкі, бочкі, біклагі, дойніцы, ражкі з вёскі Навасады, рэшаты з вёскі Камень, цэнтрыфугі для мёду з мястэчка Бабоўня, кошыкі з саломы з мястэчка Ляхавічы, капялюшы з вёскі Баранчыцы, замкі і паравая машына (майстра Эрыка Бернадскага) з мястэчка Цімкавічы і інш. [7, с. 5].

Неабходна адзначыць, што дробная і саматужна-рамесная вытворчасць паступова выцяснялася буйнымі фабрычна-завадскімі прадпрыемствамі. У валавай прадукцыі ўдзельная вага дробнай і рамеснай прамысловасці за 1900-1908 гг. панізілася з 67% да 58,3% [8, с. 34-37]. Ва ўмовах эканамічнага крызісу і дэпрэсіі значная частка дробных вытворцаў трапіла ў залежнасць ад буйнога капіталу і практычна ператварылася ў наёмных рабочых-надомнікаў.

Развіццё прамысловасці ў Беларусі стрымлівалі і нізкія тэмпы росту гарадоў і колькасці гарадскога насельніцтва. Калі ў першай палове XIX ст. Беларусь па росту гарадскога насельніцтва займала першае месца ў Расійскай імперыі (у сувязі з гвалтоўным перасяленнем яўрэяў з сельскай мясцовасці ў гарады і мястэчкі), то паступова гэтыя тэмпы замедліліся, а слабае развіццё эканомікі краю замедліла і рост гарадоў і колькасцьіх насельніцтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Так, напрыклад, у цэлым у Расійскай імперыі, як паведамляла "Наша ніва" у № 1 ад 1 (14) студзеня 1909 г., налічвалася 1084 гарады, і гараджане складалі 13,4% ад усяго насельніцтва (16289 тыс. чалавек) [2, с. 403], то напрыклад, у Мінскай губерніі з 2570 тыс. чалавек гараджан налічвалася толькі 257 тыс., Барысаве – 18 тыс., Слуцку – 15,5 тыс., Рэчыцы – 11 тыс., Мазыры – 10 тыс., Нясвіжы – 9 тыс., Навагрудку – 8,5 тыс., Ігумене – 5 тыс., Докшыцах – 4 тыс. чалавек [8, с. 42].

У 1909 г. дэпрэсія змянілася прамысловым уздымам, які працягваўся да пачатку першай сусветнай вайны, але, як і раней, у Беларусі па тэмпах развіцця вылзялялася лесанарыхтоўчая і дрэваапрацоўчая прамысловасць. У 1913 г. яе доля ў валавой прадукцыі прамысловасці паднялася да 33% [2, с. 403].

На старонках "Нашай нівы" мы знаходзім звесткі і пра развіццё іншых галін прамысловасці. Так, у № 3 ад 15 (28) студзеня 1909 г. паведамляецца пра развіццё гарбарнай вытворчасці ў Смаргоні. У 1909 г. там налічвалася 18 гарбарных заводаў, дзе працавала 600 рабочых, і аб'ём вытворчасці складаў больш 1 млн. руб. Ёсць звесткі пра гарбарні ў Ашмянах і іншых месцах [9, с. 116].

Шмат бровaрных заводаў у Мінскай губерні, больш чым у іншых губернях Расійскай імперыі. У 1909 г. у Мінскай губерніі налічвалася 9 казённых вінных складоў, 15 спіртаачышчальных заводаў і 207 бровараў. Казна атрымала даход у 5546 тыс. руб. Было прададзена на месцы 1 млн. 77 тыс. вёдзер, у Маскву адпраўлена на продаж 1 млн. 63 тыс. вёдзер, у Гродзенскую губернію – 22 тыс вёдзер [9, с. 116].

Ёсць звесткі і пра хаўрус слуцкіх памешчыкаў, якія вырашылі разам пабудаваць вялікі цукровы завод, пра стварэнне земскай школы рамяства ў мястэчку Ракаў Мінскай губерніі, аб развіцці ткацтва ў Беларусі і стварэнні школы рамяства ў мястэчку Рэжыцы Віцебскай губерніі Таннай Мооль, дзе навучалася 18 дзяўчат, яўрэйскіх школ рамяства-варштатаў у Вільні, Мінску, мястэчку Маладзечна і іншых месцах [9, с. 117].

У гады прамысловага ўздыму першыя заводы і фабрыкі ўзніклі ў аграрна-абутковай вытворчасці ("Арол" у Мінску і іншых гарадах). У 1913 г. колькасць фабрык і заводаў у Беларусі вырасла да 1282, а рабочых да 54,9 тыс. чалавек, але па-ранейшаму дробныя і рамесна-саматужныя прадпрыемствы давалі больш паловіны прамысловай прадукцыі. У 1913 г. тут працавала 184,8 тыс. чалавек, а колькасць наёмных рабочых у сферы дробнай і саматужна-рамеснай вытворчасці дасягала 94 тыс. руб. [10, с. 11-38]. Беларусь значна адставала ад агульна-расійскага ўзроўню развіцця прамысловасці і заставалася, як і раней, аграрным рэгіёнам у складзе Расійскай імперыі.

### *Літаратура*


1. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. Мн., 1972. Т. 2.
2. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1994. Ч. 1.
3. Наша ніва. Вып. 1. 1906-1908. – Мн., 1992. – № 5.
4. Наша ніва. Вып. 1. 1906-1908. – Мн., 1992. – № 7.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Наша ніва. Вып. 1. 1906-1908. – Мн., 1992. – .№ 8.
6. Наша ніва. Вып. 1. 1906-1908. – Мн., 1992.. – № 17.
7. Наша ніва. Вып. 2. 1909. – Мн., 1996.– № 1.
8. Наша ніва. Вып. 2. 1909. – Мн., 1996. – № 3.
9. Наша ніва. Вып. 2. 1909. – Мн., 1996. – № 8
10. Экономика Белоруссии в эпоху империализма. Мн., 1963.

## СЯЛЯНСКАЕ ПЫТАННЕ НА СТАРОНКАХ “НАШАЙ НІВЫ” Ў 1909 ГОДЗЕ

А.А. Цобкала г. Мінск, Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце РБ

“Наша ніва”, заснаваная лідэрамі Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ) братамі І. І А. Луцкевічамі, В. Іванаўскім і інш., аб’яднала і згрунтавала вакол сябе лепшых, найбольш знакамітых прадстаўнікоў і барацьбітоў за нацыянальнае, сацыяльнае і эканамічнае адраджэнне Беларусі (Я. Купала, Я. Колас, З. Бядуля, В. Ластоўскі, С. Палуян і інш.), што спрыяла шырокаму распаўсюджванню газеты на Беларусі і далёка па-за яе межамі.

М. Багдановіч, характарызуючы дзейнасць дадзенага выдання, пісаў: “Наша ніва” вяла нястомную асветніцкую работу. Ставячы сваёй мэтай усебаковае адраджэнне беларускай народнай культуры і, значыць, цвёрда стоячы на пэўнай дэмакратычнай пазіцыі, яна прабіла сабе дарогу ў самыя глухія куткі Беларусі, у самыя цёмныя слаі насельніцтва. Для многіх тысяч людзей яна з’яўляецца першай газетай, прачытанай імі, першай крыніцай ведаў, што не насіла казённай пячаці, выкладзенай простай і яснай мовай. Для беларускага селяніна, які зжыўся з думкай, што ён – хам, а яго мова – хамская, “Наша ніва” друкавана звярнулася на гэтай мове, выклікаючы ў ім тым самым павагу і да сябе самога, абуджаючы ў ім пачуццё ўласнага гонару. У беларускім краі, змучаным нацыянальнай барацьбой, “Наша ніва” няспынна нагадвала пра неабходнасць паважаць правы кожнага народа, цаніць усякую культуру і, замацоўваючы свае нацыянальныя асновы, шырока карыстацца набыткамі культуры як польскай, так і велікарускай і ўкраінскай. Гэта, а таксама многае іншае, неабходна пастаянна мець на ўвазе, улічваючы значэнне сціплай штотыднёвай беларускай газеткі памерам у адзін друкаваны аркуш [1, с. 411].

Тэматыка, змест і характар падачы апублікаваных матэрыялаў мяняліся ў залежнасці ад палітычнай сітуацыі, складу рэдакцыі. Так, у перыяд рэакцыі кіраўнікі “Нашай нівы” па агульнапалітычных, сацыяльна-эканамічных пытаннях знаходзіліся на ліберальна-народніцкіх, асветніцкіх пазіцыях. Вырашэнне вышэйназваных пытанняў злілося з рэалізацыяй Маніфеста 17 кастрычніка, з дзейнасцю Дзяржаўнай думы, земстваў, увядзеннем усесаслоўнай воласці, заменай валасных судоў выбарнымі міравымі судамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ